УДК 2 (476)

# СТАНАЎЛЕННЕ АРГАНІЗАЦЫІ «ROMUVA» У СУЧАСНАЙ ЛІТВЕ

***А. У. Смірноў*** (МДУ імя А. А. Куляшова)
Навук. кір. ***В. У. Старасценка***,
канд. філас. навук, дацэнт

«Рамува» як рэлігійная абшчына балцкай веры была афіцыйна зарэгістраваная распараджэннем уладаў Літоўскай Рэспублікі 27 траўня 1902 года. Незадоўга да рэгістрацыі ў колах арганізацыі вяліся дыскусіі на тэму таго, як менавіта трэба афіцыйна зарэгістраваць абшчыну – як рэлігійнае аб'яднанне асабліва «літоўскай» веры ці ж зрабіць акцэнт на яе агульнабалтыйскім характары? У рэшце рэшт выбар быў зроблены на карысць другога варыянту, а тлумачылася гэта лідэрамі арганізацыі тым, што дадзены культ лічыцца імі роднасным ўсім народам, якія насяляюць балтыйскі рэгіен і ў чыім этнагенезе прысутнічае балцкі субстрат, а ў культуры – агульныя з літоўцамі рысы. Да такіх народаў лідэры абшчыны адносілі жамойтаў, яцвягаў, латышоў, латгалаў і беларусаў. Трэба пазначыць, што якой-небудзь іерархічнай сістэмы накшталт царкоўнай «Рамува» не прадугледжвала, аднак фактычна адразу прынялася за ўвядзенне пасады «вайдэлота» – жрэцтва. Зроблена гэта было з мэтай захавання стабільнасці ўнутры арганізацыі [1, с. 194]. «Рамувоўцы» святкавалі каляндарныя, сямейныя, нацыянальныя і іншыя святы. Рэлігійныя абрады выконваліся на прыродзе пад адкрытым небам, у хатніх «святых месцах» і іншых месцах [2, с. 4]. 19 кастрычніка 2002 года пасля пастановы нядаўна абраных «вайдэлотаў» на гары Гедымінавай магілы ў Вільні быў прызначаны «Крывіс» – вярхоўны жрэц літоўскай «Рамувы» ў асобе Енаса Трынкунаса. Інаўгурацыя скончылася ўрачыстым уручэннем Трынкунасу сімвала «Крывіса» – «крывулі», што ўяўляла з сябе жазло са скрыўленым канцом. На адкрыцці ў Вільні Сусветнага кангрэса этнічных рэлігій (1998 г.) з урачыстым прывітаннем выступіў дэпутат Сейма Літвы Г. Якаваніс, які фактычна прызнаў за тым сваю прыхільнасць да гэтага рэлігійнага аб'яднання. Акрамя яго аб сваёй прыналежнасці да «Рамувы» адкрыта абвяшчалі яшчэ 4 дэпутаты Сейма. Цяжка знайсці ў Еўропе яшчэ адну такую краіну, дзе рэлігійныя аб'яднанні, закліканыя адрадзіць «рэлігію продкаў», атрымлівалі б такую ж увагу і падтрымку з боку дзяржавы [2, с. 195, 196].

## Літаратура

1. **Трынкунас, Е.** Шлях старалітоўскай веры / Е. Трынкунас. – Смаленск : пер. з літ. А. Мікус, Інбелкульт, 2019. – 208 с.

2. **Кашкурэвіч, Т.** Druvis: Almanach Centru Etnakasmalohiji № 1 / Т. Кашкурэвіч. – Мінск, 1992. – 243 с.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова